# Чырвоным па беламу



У рамках творчага праекта-свята "Дзень вышыванкі", які прайшоў у г. Мінску, адбылося падвядзенне вынікаў фотаконкурсу "Сэлфі & фота ў вышыванках". У намінацыі "Арыгінальнае сэлфі & фота ў вышыванцы" лаўры пераможцы дасталіся асіпаўчанцы Вользе ВАРАНЕЦ.

— Маю пасаду вядучага спецыяліста сектара механізацыі ўпраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання Асіповіцкага райвыканкама творчай не назавеш. Аднак вольны час я цалкам прысвячаю рукадзеллю. Вязанне кручком, валянне з воўны, вышыўка крыжыкам, выраб кветак з фаамірана на абручы, заколкі — гэта далёка няпоўны спіс маіх хобі, — распавядае Вольга. — Дадам, што работы не пыляцца дома на паліцах. Я заўсёды імкнуся ўдзельнічаць у выставах, якія праходзяць у межах такіх вядомых культурных мерапрыемстваў, як "Александрыя збірае сяброў", "Вянок дружбы", "Дажынкі", а таксама раённага і абласнога конкурсу прафсаюзаў "Новыя імёны Беларусі". Каб падтрымаць антураж гэтых свят, я вырашыла пашыць сабе сукенку ў беларускім народным стылі. У гэтым годзе вышыла яшчэ і кашулю. А даведаўшыся з сацыяльнай сеткі "Одноклассники" аб правядзенні конкурсу "Сэлфі & фота ў вышыванках", вырашыла ў ім паўдзельнічаць. Выклала сваю фатаграфію ў "Одноклассники" і "Вконтакте" і стала збіраць "лайкі", бо менавіта іх колькасць вызначала пераможцу.

Сёння "вышыванка" — гэта не толькі патрыятычна, але і модна сярод людзей розных узростаў, у тым ліку моладзі. Выкарыстоўваючы нацыянальны арнамент у паўсядзённым жыцці, мы выказваем сваю і грамадзянскую пазіцыю, культурную адукаванасць і духоўную свядомасць. Бо беларускі арнамент — гэта не проста ўпрыгожванне, гэта своеасаблівы шыфр, які праз стагоддзі перададзены нам продкамі і валодае станоўчым сэнсам. Кожны ўзор — гэта сімвал, які мае магутную энергетыку і нясе пазітыўны пасыл.

Ганна ВЕЖНЯВЕЦКАЯ,
раённая газета «Асіповіцкі край»